Сугучча

# Сіла гуманітарнага супрацоўніцтва

**Выдавецкі дом «Звязда» і Грамадскі прэс-цэнтр Дома прэсы пры падтрымцы Пасольства Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь правялі круглы стол «Беларусь — Узбекістан: культурныя і гуманітарныя ініцыятывы».**




Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Сучасныя інтэрнэт-магчымасці дазволілі арганізаваць віртуальную сустрэчу зацікаўленых бакоў. А тое, што зацікаўленасць сапраўды ёсць, пераконвае шырокі ўдзел калег з Ташкента ў абмеркаванні тэмы. Да ўдзелу ў размове прычыніліся: намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Узбекістана Гайрат Мажыд, намеснік галоўнага рэдактара аб'яднанай рэдакцыі часопісаў «Шарк Юлдузі» — «Звезда Востока» Азіз Саід, пісьменнік Кучкор Наркабіл, загадчык аддзела міжнародных літаратурных сувязяў і мастацкага перакладу Рустам Мусурмон, перакладчыца, празаік Рысалат Хайдарава.

Гаворку вялі пра ролю культуры ў захаванні ўзаемапавагі і братэрскага суіснавання народаў Беларусі і Узбекістана, пра ўдзел узбекскіх пісьменнікаў у беларускіх круглых сталах «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго» ў праграме Дзён беларускага пісьменства, штогадовых мінскіх Міжнародных сімпозіумах літаратараў «Пісьменнік і час», пра рэаліі і перспектывы беларуска-узбекскіх літаратурных кантактаў і ролю ў іх развіцці мастацкага перакладу, пра вобраз Беларусі ў сучаснай узбекскай літаратуры і Узбекістана ў беларускай. Такія размовы і ўзбагачаюць кожны з бакоў, і дазваляюць узяць нешта на ўзбраенне з пункту гледжання арганізацыі творчай працы, арганізацыі адносін грамадства і творцаў, дзяржавы і творцаў. Па нашай просьбе віртуальны круглы стол пракаментаваў **намеснік дырэктара выдавецкага дома «Звязда» — галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» Аляксей ЧАРОТА:**

— Міжнародныя літаратурныя і гуманітарныя стасункі заўсёды прыцягальныя. Нават з пункту гледжання развіцця творчых памкненняў паэтаў, празаікаў, перакладчыкаў. Успомніце гісторыю. Мікалай Гумілёў падарожнічаў у Афрыку. Валерый Брусаў настолькі зрадніўся з Арменіяй, армянскай паэзіяй, што стаў народным паэтам гэтай каўказскай рэспублікі. У трыццатыя Эдуард Самуйлёнак, Барыс Мікуліч падарожнічалі па Грузіі, прывезлі адтуль свае сімпатычныя празаічныя творы. Сёння цяжка наведваць новыя краіны, цяжэй адкрываць нешта новае асабліва ва ўмовах пандэміі. Але ж так не хочацца губляць напрацаваныя раней сувязі!.. Таму мы і вялі размову — пра тое, што друкаваць, што перакладаць, якія сумесныя выданні мы можам ажыццявіць сёння, як зрабіць так, каб да ўзбекскага чытача новага пакалення паранейшаму даходзіла беларускае мастацкае слова...

Саветнік па палітычных пытаннях Пасольства Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Даніяр Абідаў таксама ўдзельнічаў у круглы стале. І вось што ён заўважыў пасля карэспандэнту «Звязды»: «Нам яшчэ і дзеля таго трэба весці дыскусіі, не губляць гуманітарны характар адносін, каб, вырваўшыся праз час з цiскоў пандэміі, пашырыць турыстычны, пазнавальны характар нашых узаемадачыненняў. Каб беларусы з цікавасцю ехалі за ўражаннямі ў Самарканд і Бухару, а ўзбекі адкрывалі Мір, Нясвіж, Белавежскую пушчу, іншыя цуды, адметнасці вашай краіны, яе гістарычнага, геаграфічнага ландшафту...»

**Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ.**

Слова — чытачам «Звязды»

## «СЁННЯ ЁСЦЬ ПАТРЭБА Ў ПАДТРЫМАННІ ЛІТАРАТУРНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ»

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Іван ШТЭЙНЕР, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры філалагічнага факультэта Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Францыска Скарыны, літаратуразнавец, літаратурны крытык, пісьменнік:**



www.gsu.by

— Для мяне як для чытача «Звязды» вельмі важна, што найстарэйшая газета Беларусі ва ўсе часы звяртала пільную ўвагу на літаратурнае жыццё краіны. Менавіта тут друкаваліся мастацкія творы як пачаткоўцаў, так і айчынных класікаў, мелі магчымасць заявіць аб сабе студэнты-філолагі. На старонках «Звязды» выходзілі ў свет лепшыя ўзоры публіцыстыкі. Гэта, безумоўна, спрыяла развіццю літаратурнага працэсу ў нашай краіне. Друкаваліся значныя і аб'ектыўныя рэцэнзіі, прысвечаныя знакавым творам пісьменнікаў Беларусі. Лічу за гонар, што таксама друкаваўся ў найстарэйшай роднай газеце. Сёння ёсць патрэба ў падтрыманні літаратурнай супольнасці, правядзенні на старонках выдання літаратурных конкурсаў, творчых спаборніцтваў. На маю думку, было б вельмі добра, каб гэтыя традыцыі «Звязды» працягваліся і надалей.

## Падсілкаваць гаджэт перад цягніком

**БЧ устанавіла на вакзалах пункты для бясплатнай зарадкі мабільных прылад.**

Як паведамляе прэс-цэнтр магістралі, адпаведнае абсталяванне з'явілася на 19 чыгуначных вакзалах.

У залежнасці ад месца размяшчэння пункту для зарадкі бываюць двух відаў. Стойкі з фірменным афармленнем аснашчаны як разеткамі, так і USB-раздымамі. Дадаткова для зручнасці пасажыраў пад стальніцай стойкі абсталяваны кручкі для сумак або рукзакоў. На Беларускай чыгунцы звяртаюць увагу пасажыраў, што за захаванасць мабільных прылад і асабістых рэчаў падчас зарадкі адказваюць яны самі.

У прэс-цэнтры БЧ нагадалі, што на чыгуначных вакзалах таксама па-ранейшаму даступная паслуга платнай зарадкі мабільных прылад — калі за невялікія грошы можна пакінуць тэлефон на зарадку пад наглядам работніка вакзала ці ў спецыяльнай ячэйцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Сацыяльны ракурс

# РАЗМЕРКАВАЦЬ І ЗАМАЦАВАЦЬ

### У сталіцы на першым рабочым месцы застаецца толькі палова маладых педагогаў

**У 2019 годзе ў службе занятасці было зарэгістравана ўсяго толькі 530 выпускнікоў усіх відаў навучальных устаноў. Найчасцей дапамога ў працаўладкаванні патрабуецца выпускнікам вышэйшых навучальных устаноў, сярод якіх амаль чвэрць — з кваліфікацыяй «эканаміст» і кожны пяты — з кваліфікацыяй «юрыст». Пра гэта на сустрэчы з журналістамі паведаміў начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.**

«Калі казаць аб выпускніках сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, то з іх таксама ў службы занятасці часцей за ўсё звяртаюцца юрысты, эканамісты і бухгалтары. Летась пры садзейнічанні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне было працаўладкавана 412 чалавек, у тым ліку выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі — 140 чалавек, выпускнікоў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі — 230 чалавек і 42 выпускнікі ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Сёлета па дапамогу ў працаўладкаванні звярнуліся 199 выпускнікоў і 163 чалавекі ўжо працаўладкаваны па атрыманай спецыяльнасці», — запэўніў Алег Токун.

Асноўнымі заказчыкамі кадраў, якія рыхтуюць у БДПУ, з'яўляюцца ўстановы адукацыі Мінска і Мінскай вобласці. Пра гэта паведаміў **прарэктар па вучэбнай рабоце Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Аляксандр МАКОЎЧЫК.**

«Штогод пасля заканчэння ўніверсітэта ў нас размяркоўваецца каля 800 чалавек — усе 100 працэнтаў выпускнікоў. Больш за тое, сёння мы не можам задаволіць усе патрэбы Мінска па спецыяльнасцях «пачатковая адукацыя» і «дашкольная адукацыя», — расказаў прарэктар БДПУ. — Маладым людзям, якія навучаліся на ўмовах аплаты, таксама даецца магчымасць атрымаць першае рабочае месца шляхам размеркавання, праўда, пры наяўнасці свабодных вакансій або індывідуальнага запыту з будучага месца працы. Так, у 2018 годзе выказалі жаданне размеркавацца сем выпускнікоў, якія навучаліся на платнай аснове, летась — чатырнаццаць, у 2020 годзе — тры. А вось выпадкі адмаўлення ад размеркавання — адзінкавыя».

Аляксандр Макоўчык адзначыў, што эфектыўнасць замацавання маладых спецыялістаў шмат у чым залежыць ад дзеяннаў мясцовых органаў улады, кіраўнікоў устаноў адукацыі, прафсаюзных камітэтаў, ад той ступені падтрымкі, якую ім аказваюць на першым рабочым месцы, ну і, канешне, ад унутранай матывацыі. На бюджэтнай аснове ва ўніверсітэце штогод навучаецца 870 студэнтаў. Каля 200 з іх — гэта выпускнікі педагагічных класаў, якія зрабілі выбар свядома, бо ўжо знаёмыя з усімі нюансамі прафесіі педагога. Яшчэ каля 200 чалавек заключаюць мэтавыя дагаворы на навучанне. І тыя, і другія пасля заканчэння вучобы павінны будуць адпрацаваць пяць гадоў на тым месцы, куды іх накіруюць.

«Забеспячэнне працоўных і сацыяльных правоў і інтарэсаў работнікаў, у тым ліку маладых спецыялістаў, вучнёўскай моладзі, падтрыманне стабільнай работы калектываў з'яўляецца адной з галоўных нормаў галіновага пагаднення, заключанага паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і прафсаюзам работнікаў адукацыі і навукі, — паведаміла **загадчык аддзела арганізацыйнай работы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аксана ВАСІЛЕВІЧ.** — Прадстаўнікі прафсаюза прымаюць актыўны ўдзел у размеркаванні маладых спецыялістаў, аказваюць садзейнічанне ў вырашэнні жыллёвых пытанняў, даюць юрыдычную кансультацыю, а таксама аказваюць кансультацыйную падтрымку і прававую дапамогу ў перыяд адпрацоўкі. Дарэчы, па інфармацыі галіновага прафсаюза, паказчык замацавання педагагічных кадраў пасля двух гадоў адпрацоўкі вагаецца па краіне ў межах 75—80 працэнтаў. Самы нізкі паказчык — у Мінску, дзе на першым рабочым месцы застаюцца толькі 50 працэнтаў педагогаў. А самы высокі — у Брэсцкай вобласці (90 працэнтаў).

Не можа быць!

## Студэнтамі БДУ сталі трайняты

**Ва ўніверсітэце не могуць прыгадаць падобнага выпадку за апошнія гады. Сюды на першы курс факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі паступілі члены адной сям'і — трайняты Алена, Віталь і Аляксей Гімбіцкія.**




Фота прэс-службы БДУ.

Усе яны з залатымі медалямі скончылі Глыбоцкую раённую гімназію і неаднаразова станавіліся прызёрамі раённых і абласных прадметных алімпіяд. Пры выбары факультэта кіраваліся яго прэстыжнасцю і падрыхтоўкай там высокакваліфікаваных спецыялістаў для ІТ-галіны.

У якасці абітурыентаў Віталь набраў 387 балаў, Аляксей — 373 і Алена — 383. Пры гэтым па матэматыцы ў Віталя 100 балаў, а ў Аляксея і Алены па 98 балаў.

Усе паступілі на «бюджэт» і выбралі спецыяльнасць «інфарматыка». Зараз яны навучаюцца ў адной групе. Дарэчы, пра ФПМІ даведаліся падчас удзелу ў Рэспубліканскай летняй навукова-даследчай школе вучняў і настаўнікаў. Прафарыентацыйнае мерапрыемства традыцыйна арганізуецца ў летні перыяд і дазваляе школьнікам у рамках навуковых семінараў і практычных заняткаў паглыблена вывучыць абраныя дысцыпліны.

Зараз браты і сястра адаптуюцца ва ўніверсітэце і студэнцкім інтэрнаце, з цікавасцю вывучаюць новыя прадметы. У будучыні ўсе трое плануюць звязаць сваё жыццё з ІТ-тэхналогіямі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**